себе черты поэтического и прозаического текстов, репрезентация данной мифологемы носит фрагментарный, дискретный характер.

**Литература**

1. Баратынский, Е.А. Стихотворения и поэмы / Е.А. Баратынский. – М.: Профиздат, 2011. – 256 с.
2. Барт, Р. Избранные работы: Семиотика. Поэтика / Р. Барт. – М., 1994. – 616 с.
3. Белый, А. Котик Летаев[Электронный ресурс] / А. Белый. – Режим доступа: http://az.lib.ru/b/belyj_a/text_0470.shtml. – Дата доступа: 18.02.2017.
4. Гадамер, Х.-Г. Истина и метод: Основы философской герменевтики / Х.-Г. Гадамер; общ.ред. и вступ. ст. Б.Н. Бессонова. – М.: Прогресс, 1988. – 704 с.
5. Доманский, В.А. Русская усадьба в художественной литературе XIX века: культурологические аспекты изучения поэтики [online] / В.А. Доманский. – Режим доступа: http://sun.tsu.ru/mminfo/000063105/291/image/291_56-60.pdf. – Дата доступа: 18.02.2017.
6. Ильина-Боратынская, О.А. Канун Восьмого дня / О.А. Ильина-Боратынская. – СПб: Славия, 2012. – 352 с.
7. Лотман, Ю.М. В школе поэтического слова: Пушкин, Лермонтов, Гоголь / Ю.М. Лотман. – М.: Просвещение, 1988. – 352.
8. Рогачева, Н.А. Категория запаха в поэзии Андрея Белого / Н.А. Рогачева // Вестник Тюменского государственного университета. Социально-экономические и правовые исследования. – № 2. – 2005. – С. 263–268.
9. Топоров, В.Н. Исследования по этимологии и семантике. Т. 1 Теория и некоторые частные ее приложения / В.Н. Топоров. – М.: Языки славянской культуры, 2004. – 818 с.
10. Щукин, В.Г. Российский гений просвещения. Исследования в области мифопоэтики и истории идей / В.Г. Щукин. – М.: РОССПЭН, 2007. – 608 с.
11. Эпштейн, М.М. Природа, мир, тайник Вселенной. Система пейзажных образов в русской поэзии / М.М. Эпштейн. – М.: Высшая школа, 1990. – 303 с.

**O.A. Grinevich**
YankaKupala State University of Grodno
e-mail: olga.grinevich.1994@mail.ru

**The phenomenology of reality in the poetics of the manor text: the myth of destruction and restoration (for example, the novel A.Bely "Kotik Letaev")**

*Key words: manor myth, manor text, phenomenology, category of memory, mythopoetics.*

*The article considers the relation of manor myth of Russian literature from the phenomenological representation of reality in autobiographical prose (for example, the novel A.Bely "Kotik Letaev"), and imposing on the literary model of manor features individual artistic style of the writer and his worldview.*

**М.І. Кірушкіна**
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны
e-mail: k.marusia90@mail.ru

УДК 821.161.3–1–055.2

**МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ КАТЭГОРЫІ БЫЦЦЯ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЖАНОЧАЙ ПАЭЗІІ**

*Ключавыя словы: катэгорыя “быццё”, макракосмас, “быццё-ў-свеце”, гармонія, Бог, творчая канцэпцыя.*

*Сучасная беларуская жаночая паэзія акцэнтуе ўвагу на духоўна-псіхалагічных, філасофскіх і рэлігійных паняццях. У паэтычных тэкстах логіка разваг і жыццёвых перакананняў аўтара рэалізуецца ў катэгорыі “быццё”. Рэфлексіўны характар маюць такія вершы, у якіх канцэпцыя паэтак разглядаецца з дапамогай экспрэсіўнага выражэння думкі, спалучанага з творчай ідэяй. Сучасная беларуская жаночая паэзія мала вывучана, што тлумачыць навізну працы.*

Сучасная беларуская жаночая паэзія арыентуецца на асэнсаванне маральна-этычных, філасофскіх праблем, разгляд якіх разам з аб’ектыўным адлюстраваннем рэчаіснасці немагчымы без даследавання прыватнага жыцця асобы, засяроджанасці на яе ўнутраным свеце. Матывы самоты, суму і адзіноты складаюць аснову мастацка-эстэтычнай сістэмы творцаў. Паэткі (Л.Раманава, Н.Кудасава, А.Данільчык, Н.Русецкая, І.Лобан і інш.), акрамя прэзентацыі “жаночай суб’ектыўнасці”, мадэлююць адметныя вершатэксты, складнікам якіх з’яўляюцца элементы філасофскага пачатку.

Спецыфіка сучаснай жаночай паэзіі – гэта стварэнне паэткамі ўласнай гармоніі, дзе праз сінтэз духа і цела ілюструецца метафізічная прастора душы лірычных гераінь, увасабляецца мікракосм аўтара. У цэнтры ўвагі жанчын-творцаў – мастацкае даследаванне катэгорый быцця, жыцця і смерці, інтэрпрэтацыя іх філасофскага зместу.

Галоўнай інтэлектуальна-філасофскай катэгорыяй у іх паэзіі з’яўляецца “быццё”. У філасофскім слоўніку [1] падаецца наступная дэфініцыя дадзенага паняцця: гэта катэгорыя, якая фіксуе аснову існавання для свету цалкам або для кожнага, хто ці што існуе ў гэтым свеце.

Катэгорыя “быццё” набывае адметнае значэнне ў вершатворчасці Л.Раманавай. Светабачанне паэткі грунтуецца на ідэі сцвярджэння анталагічнай еднасці паміж унутраным светам асобы і макракосмасу.



Репозиторий ВГУ

Згодна мастацкай тэорыі Л.Раманавай існаванне душы звязана з быццём, паколькі гэта таксама форма свядомасці асобы. Паэтка ўвасабляе думку, што цэнтрам быцця ёсць Бог:

Госпадзе
з-пад зямлі
над зямлёй <…>
Госпадзе
будзь са мной" [6, с.56].

Тэндэнцыя звароту да Усявышняга і да формы паэтычнай малітвы ператвараецца ў вершатэксце ў дзейсны сродак мастацкай выразнасці. Змястоўнасць, эмацыянальнасць вершаваных радкоў апелюе да адзінства ўласнай самаарганізацыі і ўмоўнага лірычнага сюжэта.

Зварот аўтаркі да трансцэндэнтнага заўважны, бо "мроіцца тое, // што немагчыма // сустрэць на зямлі" [6, с.18]. Рэалізаваная ў вершах анірычная форма рэальнасці (сна) дазваляе лірычнай гераіне дакрануцца да боскіх істот і адначасова зразумець марнасць прывіднага шчасця:

Анёлы, аднак, праз сон заходзяць, бывае.
Штось дзівоснае творыцца ў сьне.
А на сьвітаньні – усё зьнікае:
Рай рассыпаецца ў цьмяным акне [6, с.18].

Толькі ў сне лірычная гераіня перадае свае перажыванні, у выніку чаго паэткай паказваюцца імгненні і жаданні душы чалавека, яе эмацыйна-ўзрушаны стан.

Паэтка імкнецца акрэсліць быццё чалавека і яго месца ў сусвеце. Л.Раманава прыйшла да высновы, што ў свеце ўсё ўзаемазвязана: усе жывыя істоты нясуць у сабе часцінку боскай душы.

Як птушка, што ня мае крылаў,
як рыба без плаўнікоў,
як вада, што зь зямлі застылай
прарываецца зноў і зноў,
я цяку, і плыву, і падаю,
у падзеньні намацваю дно
Да апошняга сабраць адно цэлае
мне не дадзена ўсё адно… [6, с.26].

Лірычная гераіня бачыць частку сябе ў рыбах і птушках. Дадзеныя вобразы ўдакладняюць гарманічную сувязь чалавека са светам прыроды, і ў гэтым выпадку жыццю надаецца працэсуальнае значэнне. Відавочная апеляцыя да першабытнага пантэізму. Аўтар свядома стварае карціну, дзе прыродныя элементы адухаўляюцца. У працэсе разгортвання асацыяцый падкрэсліваецца і значэнне вады – крыніцы самога жыцця. А рух жыцця патрабуе ўсведамлення яго сэнсу. Пры гэтым Л.Раманава адзначае, што "у людзей жа іншы лёс // нарадзіцца каб не ведаць // хто цябе сюды прынёс" [6, с.21]. Пошук сутнасці свайго існавання, яго зместу праяўляецца ў вечным светапазнанні рэчаіснасці.

Паэтычныя творы Л.Раманавай ўвасабляюць гарманічны пачатак: паэтка стварае сваё бачанне свету з аналітычным вылучэннем істотнага (душы) і рэпрэзентацыяй раўнапраўнага "дыялогу" паміж асобай і акаляючым светам.

Разважае пра сутнасць свайго існавання ў свеце і Н.Кудасава. Паэтка робіць выключна анталагічныя вынікі:

Вечнасць?
Спрэчна.
Хутчэй,
пустэча
для таго,
хто нічым
ці нечым
называе
адзіны шлях [4, с.12].

Самасвядомасць лірычнай гераіні падпарадкоўваецца крытычным развагам наконт існавання вечнасці. Жыццёвы шлях асобы атаясамліваецца з "нічым" або "нечым". Такое ўспрыняцце рэчаіснасці звязана не толькі з характарыстыкай прасторавага хранатопа, але і з рэфлексіяй суб'екта.

Творчая канцэпцыя Н.Кудасавай звернута да пошуку ўласнай гармоніі, якая залежыць ад матэрыяльнага свету:

Прыціснутыя цітламі будняў,
Незаўважна губляем гукі,



Репозиторий ВГУ

Якія робяць нас
Сапраўднымі словамі [4, с.19].

Супастаўляльная пазіцыя "Я" – "рэчаіснасць" сінанімічная спалучэнню "гукі" – "словы". Лірычная гераіня разважае аб мяжы паміж пэўнымі паняццямі нашага існавання ў макракосмасе, якая парушаецца праз лагічнасць быцця. У такой сітуацыі, залежнай ад метафізічнай структуры свету, эмоцыі і пачуцці, або гукі, матэрыялізуюцца, а душа персаніфікуецца ў словы. Ідэйна-эстэтычны досвед, логіка разваг і жыццёвых перакананняў паэткі скандэнсавана ў такой мадэлі быцця, дзе прыватнае замест агульнага алыходзіць на іншы план.

У межах філасофскага асэнсавання катэгорыі "быццё" вылучаецца асобная яе форма "быццё-у-свеце", якая арыентавана на доказы існавання быцця знешняга свету, і якім чынам яно ўплывае на экзістэнцыю асобы (паводле М.Хайдэгера [8]).

Адметная форма быцця асобы ў межах рэальнасці рэалізуецца ў вершы А. Данільчык:

Свет,
які быў створаны
на момант майго нараджэння,
цалкам задавальняў
сваёй прыгажосцю [2, с.19].

У лірычным творы анталагічныя развагі лірычнай гераіні спалучаюцца з лагічным вынікам любой аксіялагічна-экзістэнцыянальнай сітуацыі. Асабістыя адчуванні, ілюзія, інтуіцыя, што ствараюць індывідуальны свет асобы, пад уплывам часу замяняюцца рацыянальным асэнсаваннем рэчаіснасці:

Свет,
які існуе на дадзены момант,
не страціў сваёй прыгажосці.
Проста я бачу яе адваротны бок [2, с.19].

А.Данільчык сцвярджае думку, што асксіялагічныя арыенціры чалавека могуць падвяргацца ацэнцы на аснове ўнутраных перакананняў пры ўмове, што рэчаіснасць застанецца нязменнай.

У вершы "Авалодванне" паэтка выяўляе гармонію як адну з відавочных спосабаў праяўлення быцця:

Не бойся.
Гэта не парушэнне раўнавагі,
гэта ўзмацненне гармоніі.
І акаляючыя цябе людзі і рэчы
любой сваёй выявай уздымуць цябе яшчэ вышэй.
 А пасля таго, як пачуцці ператворацца ў словы,
 яны пакінуць цябе, каб вярнуцца і нагадаць –
 ты ёсць! [3, с.25].

З мэтай ўсведамлення сябе і адчування раўнавагі А.Данільчык стварае пэўную іерархію каштоўнасцей, якая мае звычайныя жыццёвыя складнікі – людзі, рэчы, пачуцці. На шляху да ўсведамлення свайго ўласнага "Я" ствараюцца адносіны і да акаляючага свету.

Даволі важнай формай быцця з'яўляецца фарміраванне самапазнання асобы. У вершатэксце Н.Русецкай разглядаеццца спецыфіка наяўнасці свайго асабістага свету з мэтай усведамлення і адчування "сябе":

калі ў цябе ёсць
свой свет ці сусвет
ты адчуваеш
межы альбо бязмежжа
калі ты за мяжой
адчуваеш сябе
паабапал [7, с.43].

Калі чалавек знаходзіцца за межамі свайго сусвету, у большасці выпадкаў ён са сваімі думкамі і перакананнямі належыць да аб'ектыўнай сферы пазнання рэчаіснасці. Суб'ектыўны пачатак, інтуіцыя даюць асобе права на выбар сваёй жыццёвай пазіцыі. Н.Русецкая сцвярджае, што дасягенне асабістай цэласнасці павінна фарміравацца ў адчуванні прасторы ("бязмежжа") або абмяжоўвацца нечым (быць ва ўласнасці "межаў").

Глыбокая ўнутраная рэфлексія спалучаецца з аб'ектыўным светам рэчаіснасці ў вершаваных радках І.Лобан. Катэгорыя "быццё" ў мастацкім асэнсаванні паэткі замяняецца падвоенай перыфразай – "пошук, або шлях да Бога". Сузіранне рэальнасці для лірычнай гераіні паэткі адбываецца на шляху да Бога, які з'яўляецца цэнтрам быцця:

Репозиторий ВГУ

Усе мы да Бога імкнемся,
Жывем па-людску, грашым,
А што яшчэ застаецца,
Калі не ўмеем жыць <…>.
Жыццё не дае нам ісцін,
Якія дае нам Бог.
Шукаем спрадвечна выйсце
Ў трохкутніку, ля дарог.
А потым душа імкнецца
Да Бога, да Яго,
Бо толькі пад уладай смерці
Спасцігнем ураз Святло [5, с.83].

Жыццё чалавека ў паўнавартасным сваім праяўленні залежыць ад Бога. На думку І.Лобан, ісціна складаецца як з пачуццёвага ўспрымання рэчаіснасці, так і з боскай міласэрнасці. Імкненне душы да Абсалюта – гэта і ёсць эмацыянальная пазнавальнасць чалавека, спалучаная з духоўным пачаткам.

Такім чынам, катэгорыя "быццё" ў мастацкім асэнсаванні сучасных беларускіх паэтак мае своеасаблівы змест: ва ўсведамленні асабістай прасторы існавання спалучаюцца суб'ектыўны і лагічны пачаткі. Свае адчуванні, думкі і перажыванні жанчыны-творцы рэалізуюць у паэтычнай рэфлексійнай форме.

**Літаратура**


1 Грицанов, А. Новейший философский словарь: 2-е изд., прераб. и дополн. / А. Грицанов. – Минск : Интерпрессервис, 2001.
2 Данільчык, А. Сон, які немагчыма забараніць : вершы / А. Данільчык. – Мінск : Кнігазбор, 2011. – 168 с.
3 Данільчык, А. Il Mezzogiorno. Поўдзень : вершы / А. Данільчык. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 116 с.
4 Кудасава, Н. Лісьце маіх рук : паэзія / Н. Кудасава. – Мінск : Логвінаў, 2006. – 76 с.
5 Лобан, І. Мая душа / І. Лобан. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2011 – 120 с.
6 Раманава, Л. Птушкі і рыбы : Паэзія / Л. Раманава. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 92 с.
7 Русецкая, Н. Каштаны ў кішэнях : вершы / Н. Русецкая. – Мінск : Кнігазбор, 2015. – 144 с.
8 Хайдеггер, М. Бытие и время / М. Хайдеггер; пер. с нем. В. Бибихина. – Харьков : "Фолио", 2003. 503 с.



**M. Kiryushkina**
Francisk Skorina Gomel State University
e-mail: k.marusia90@mail.ru


**Artistic comprehension of the category existence in modern Belorussian woman's poetry**


*Keywords: category* "existence", macrocosm, "existence-*in-the-world", the harmony, God, the creative concept.*



*Modern Belorussian woman's poetry pays great attention to psychological, philosophic and religious ideas. In various poetical works the author's logical reasoning and world view are realized in the category "existence". In some poems poetesses' conception is examined by unusual expression of thoughts, combining with definite creative concept. These poems have a reflexive nature. The newness of this work is explained by the fact that modern poetesses' writing has been studied little.*



**В.Ф. Падстаўленка**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: klit@vsu.by



УДК 821.161.3-343.09


## УПЛЫЎ НАРОДНАЙ СМЕХАВАЙ КУЛЬТУРЫ НА ВОБРАЗНУЮ СІСТЭМУ КАЗКІ "ЧОРТАЎ СКАРБ" У.КАРАТКЕВІЧА


*Ключавыя словы: народная смехавая культура, карнавал, камізм, вобразная сістэма, стыль.*



*У артыкуле даследуецца ступень уплыву народнай смехавай культуры на вобразную сістэму казкі "Чортаў скарб" У. Караткевіча. Сцвярджаецца, што аналітычна ўзважваючы факты сучаснасці і драматычныя перыпетыі мінулага, У. Караткевіч рупліва складаў матрыцу беларускай ментальнасці, унікальную і адначасна арганічную агульнасветавым культурным народазнаўчым традыцыям.*


У прадмове да кнігі "З рога ўсяго многа" (1968) Уладзімір Караткевіч па-мастацку трапна, па-філасофску глыбока прапанаваў наступнае азначэнне казкі: "Яна – чароўны сон і яна – думка чалавека" [1, с.350]. Пры ўсёй лаканічнасці тэзы пісьменнік выявіў спецыфіку гэтага любімага дзецьмі жанру, у


Репозиторий ВГУ